# Гараскоп стрыжак на верасень

***7 верасня, чацвер.*** Не стрыжыцеся і нават не падраўноўвайце свае валасы сёння: існуе магчымасць дрэннага самаадчування пасля такой працэдуры. А вось афарбоўка валасоў дабратворна адаб'ецца на вырашэнні дзелавых спрэчак.

***8 верасня, пятніца.*** Калі стрыгчыся, то толькі да абеду. Афарбоўваючы валасы сёння, рызыкуеце сваёй прывабнасцю.

***9 верасня, субота.*** Стрыжка, зробленая сёння, стане талісманам для вашай рэалізацыі і прызнання ў дзелавых колах. Можаце таксама кардынальна змяніць колер валасоў, так вы станеце выглядаць больш прывабна.

***10 верасня, нядзеля.*** Праца цырульніка над вашай прычоскай у гэты дзень дазволіць выглядаць захапляльна ўвесь наступны месяц. Афарбуйце валасы ў натуральны колер, тады вас абавязкова чакае поспех.

***11 верасня, панядзелак.*** Пасля стрыжкі валасы будуць павольней расці, але вы зможаце пазбавіцца ад дэпрэсіі. Фарбавацца можна, толькі калі захацелі стаць бландзінкай.

***12 верасня, аўторак.*** Пасля візіту ў цырульню валасы могуць пачаць выпадаць і секчыся. А вось колер валасоў можна смела мяняць.

***13 верасня, серада.*** Падстрыгаць валасы сёння — да хвароб і недаматанняў. Для афарбоўкі рэкамендуецца выкарыстоўваць фарбы на натуральнай аснове.

***14 верасня, чацвер.*** Не стрыжыце валасы сёння, каб не прыцягнуць да сябе зайздроснікаў, злых і сквапных людзей. Можна эксперыментаваць з колерам валасоў.



***15 верасня, пятніца.*** Стрыжка, афарбоўка або нарошчванне валасоў сапсуе планы на будучыню.

***16 верасня, субота.*** Стрыжка не рэкамендуецца, а афарбоўванне дапушчальнае толькі натуральнымі фарбамі.

***17 верасня, нядзеля.*** Падстрыжыце валасы сёння, гэта дапаможа прымірыцца з крыўдзіцелямі, высветліць мірна адносіны са сваякамі, сябрамі і каханымі. Афарбоўку лепш адкласці.

***18 верасня, панядзелак.*** Стрыжка катэгарычна забараняецца, бо яна можа ў далейшым вельмі неспрыяльна паўплываць на лёс. Афарбуйце валасы ў натуральны колер — і вас чакае поспех.

***19 верасня, аўторак.*** Варта адкласці стрыжку на другі дзень, каб не прыцягнуць праблемы са зрокам і здароўем вачэй. Афарбоўваць валасы можна сёння ў любыя колеры.

***20 верасня, серада.*** Неспрыяльны дзень для стрыжкі і афарбоўвання валасоў.

***21 верасня, чацвер.*** Стрыжка валасоў сёння хоць і паскорыць іх рост, але зробіць непаслухмянымі. Спрыяльны дзень для афарбоўвання валасоў — жыццё стане нашмат ярчэйшае.

***22 верасня, пятніца.*** Сёння лепш не падстрыгаць валасы тым, хто знаходзіцца ў стане дэпрэсіі або схільны да меланхоліі, бо негатыўныя думкі трывала засядуць у галаве. Для афарбоўвання — нейтральны дзень.

***23 верасня, субота.*** Вельмі добры дзень для эксперыментаў з валасамі.

***24 верасня, нядзеля.*** Людзі, якія вырашаць зрабіць сёння стрыжку, могуць у хуткім часе набыць уласнасць, а таксама адчуюць спрыяльныя змены ў кар'еры. А вось афарбоўка валасоў не пажаданая.

***25 верасня, панядзелак.*** Стрыжка спрыяльная ў першай палове дня. Для афарбоўкі — натуральныя фарбавальнікі.

***26 верасня, аўторак.*** Стрыжку лепш перанесці на іншы дзень. Афарбоўка валасоў не рэкамендуецца, яны могуць пацярпець.

***27 верасня, серада.*** Пачынаючы з другой паловы дня стрыгчыся не варта. Лепш у гэты дзень не фарбаваць валасы.

***28 верасня, чацвер.*** Падстрыгаючы валасы сёння, вы можаце запаволіць біяхімічныя працэсы ў арганізме, што справакуе назапашванне лішняй вагі. Афарбоўка валасоў на карысць сёння не пойдзе.

***29 верасня, пятніца.*** Не рэкамендуецца кардынальна змяняць прычоску, а вось змена колеру валасоў станоўча паўплывае на вашу карму.

***30 верасня, субота.*** Самы неспрыяльны дзень для стрыжкі, афарбоўвання і нарошчвання валасоў у верасні.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.28 | 19.45 | 13.17 |
| Віцебск — | 6.16 | 19.37 | 13.21 |
| Магілёў — | 6.18 | 19.36 | 13.18 |
| Гомель — | 6.17 | 19.30 | 13.13 |
| Гродна — | 6.44 | 20.00 | 13.16 |
| Брэст — | 6.47 | 19.59 | 13.12 |

**Месяц**

*Поўня 6 верасня.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**

**Пр.** *Варфаламея, Міны, Уладзіміра.*
**К.** *Рэгіны, Марка, Рычарда, Сцяпана.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## ■ Не прапусці!

# Восень з джазам і кветкамі

**Цэнтральны батанічны сад Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі запрашае мінчан і гасцей сталіцы 9 верасня на свята «Кветкі і джаз».**

Восень уступае ў свае правы, але батанічны сад працягвае радаваць сваіх наведвальнікаў разнастайнасцю сартоў і відаў восеньскіх кветак. Эстафету цвіцення перахапілі вяргіні і хрызантэмы. Найбагацейшая калекцыя вяргінь уключае каля 300 сартоў, у тым ліку сарты беларускай і ўласнай селекцыі, а калекцыя хрызантэм — каля 200.

Свята «Кветкі і джаз» прымеркаванае да 950-годдзя сталіцы. Наведвальнікаў Батанічнага сада чакаюць у гэты дзень займальныя экскурсіі-падарожжы, пазнавальны квэст «Што вы ведаеце пра вяргіні?», кансультацыі спецыялістаў па доглядзе і агратэхніцы вырошчвання восеньскіх кветак. Экскурсійныя групы будуць фарміравацца каля экспазіцыйнай аранжарэі ў 12.00 і 15.00.

Дзяцей можа зацікавіць конкурс малюнкаў на асфальце на тэму «Любімы горад», майстар-клас «Знаёмімся з лічбай 950», а таксама магчымасць «маляваць» пяском і забраць малюнак на памяць.

Да свята горада музычны дом «Класіка» падрыхтаваў для наведвальнікаў Батанічнага сада музычны сюрпрыз: выступленне легендарнага беларускага гурта, джаз-бэнда «Яблычны чай».

Цэнтральны батанічны сад з'яўляецца адным з найбуйнейшых батанічных садоў у Еўропе як па плошчы, так і па сваіх калекцыйных фондах: яго калекцыі і экспазіцыі налічваюць больш за 9 тысяч назваў раслін розных кліматычных зон свету, у тым ліку 2,3 тысячы тых, якія вырошчваюцца ў закрытым грунце.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Даты | Падзеі | Людзі

### 7 ВЕРАСНЯ

**1805** год — нарадзіўся (мястэчка Смілавічы) Ян Юзаф Бараноўскі, фінансіст, вынаходнік. Скончыў Мінскую класічную гімназію, Віленскі ўніверсітэт са ступенню кандыдата права. Служыў у розных банках Францыі, Польшчы. З 1843 года — інспектар бухгалтэрыі чыгункі Парыж — Руан — Гаўр. На сусветных выстаўках узнагароджаны: медалём за такс-машыну для кантролю праязных білетаў (Парыж, 1849), у Лондане ў 1851 годзе атрымаў Вялікі медаль за машынку для друкавання і кантролю чыгуначных білетаў. Распрацаваў сістэму аўтаматычнай сігналізацыі на чыгунцы.

**1812** год — адбылася так званая Барадзінская бітва (каля сяла Барадзіна за 124 км на захад ад Масквы). Руская войскі пад камандаваннем генерала М. І. Кутузава ўпартай гераічнай абаронай і майстэрскімі дзеяннямі сарвалі напалеонаўскі план разгрому рускай арміі ў генеральнай бітве. На расійскім баку ў ім удзельнічалі ўраджэнцы Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў, вызначыліся Брэсцкі і Мінскі пяхотныя палкі. На месцы бітвы цяпер дзейнічае Барадзінскі ваенна-гістарычны музей.



**1832** год — нарадзіўся (вёска Шаўры, цяпер у Воранаўскім раёне) Людвік Тэадоравіч Нарбут, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—1864 гадоў у Беларусі і Літве. Афіцэр рускай арміі на Каўказе, з 1859 года ў адстаўцы. У перыяд падрыхтоўкі паўстання прыхільнік партыі «чырвоных». У 1863-м — паўстанцкі ваенны начальнік Лідскага павета, адзін з першых у Беларусі сфарміраваў атрад, з якім тры месяцы паспяхова вёў барацьбу з карнікамі. Ад паўстанцкіх улад атрымаў званне палкоўніка. Загінуў у баі ў 1863 годзе.

**1923** год — на міжнародным кангрэсе ў Вене была створаная Міжнародная камісія крымінальнай паліцыі — Інтэрпол.

**1945** год — у Берліне каля Брадэнбургскіх варот адбыўся парад саюзніцкіх войскаў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі.

**1953** год — пленум ЦК КПСС выбраў першым сакратаром ЦК былога сакратара Маскоўскага гарадскога камітэта партыі М. С. Хрушчова (вызвалены ад абавязкаў 14 кастрычніка 1964-га).

### Было сказана

**Пятрусь БРОЎКА, народны паэт Беларусі:**

*«А час на твары піша й піша —*
*Усе дарогі, ўсе шляхі,*
*Усе здабыткі і грахі».*

## УСМІХНЕМСЯ

— Каханая, у цябе шнурок развязаўся.

— Дарагі, у мяне абутак без шнуркоў.

— Я ведаю, я цябе разыграў. Ніякая ты мне не каханая.

**Трэба набрацца смеласці і ўсё ж расказаць кату... што гэта ён жыве ў мяне, а не я ў яго.**

— Чаму вы бераце на работу толькі жанатых?

— Таму што яны прывыклі да абраз і не спяшаюцца дадому ў канцы працоўнага дня.

**Дастаеўскі на прыкладзе Раскольнікава паказаў, што раней рабілі з арганізацыямі, якія давалі мікрапазыкі.**

У культурыста пытаюцца:

— Колькі будзе 20 плюс 20?

— Пяцьдзясят пяць.

— Чаму пяцьдзясят пяць, калі сорак?

— Дык бо яшчэ грыф!

**Чалавек, які выдатна разбіраецца ў кавунах, пастукаўшы ў дзверы, можа зразумець — ці добрая ў кватэры жыве сям'я.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3440.

Нумар падпісаны ў 19.30 6 верасня 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12